| | | |
|---|---|---|
| | **МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**<br><br>**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ МУЗЫКІ»** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

З **26 па 29 лістапада 2026 года** Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі праводзіць Міжнародную навуковую канферэнцыю **«Музычная адукацыя ў гістарычнай перспектыве: канстанты і метамарфозы».**

У рамках канферэнцыі адбудуцца пасяджэнні секцый, круглыя сталы, лекцыі, прэзентацыі новых выданняў і майстар-класы, канцэртныя мерапрыемствы і выставы.

Праблемнае поле канферэнцыі:

- музычная адукацыя ў гістарычнай перспектыве: вытокі, этапы станаўлення, традыцыі, нацыянальныя і рэгіянальныя адукацыйныя сістэмы, канцэпцыі, інавацыі;
- музычна-педагагічныя школы: генезіс, персаналіі, вопыт;
- праблемы музычнага выканальніцтва і педагогікі на сучасным этапе;
- сучасныя ракурсы музычна-гістарычных і музычна-тэарэтычных даследаванняў;
- уклад беларускіх жанчын у развіццё музычнай адукацыі (да Года беларускай жанчыны);
- выдатныя дзеячы музычнай педагогікі – юбіляры 2026 года.

Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца даследчыкі, выкладчыкі і спецыялісты ўстаноў вышэйшай і сярэдняй адукацыі ў галіне музычнага мастацтва, дактаранты, аспіранты.

Мовы канферэнцыі – руская, беларуская, англійская.

Плануецца правядзенне канферэнцыі ў змешаным фармаце. Прадугледжаны наступныя формы ўдзелу: вочная, завочная (відэазапіс даклада з магчымасцю анлайн-адказаў на пытанні, стэндавы даклад).

Рэгламент выступлення: 20 хвілін (даклад на пленарным пасяджэнні), 15 хвілін (даклад на секцыйным пасяджэнні, паведамленне на круглым стале, прэзентацыя выдання), 5 хвілін – абмеркаванне даклада.

Заяўкі на ўдзел прымаюцца **да 9 лістапада 2026 года** па адрасе электроннай пошты nio@bgam.by

Стэндавы даклад альбо відэазапіс даклада неабходна даслаць не пазней **18 лістапада 2026 года** па адрасе электроннай пошты nio@bgam.by

Выдаткі на праезд, пражыванне і харчаванне ажыццяўляюцца ўдзельнікам канферэнцыі асабіста або ўстановай, якая яго накіроўвае.

**Па арганізацыйных пытаннях звяртацца:**

*Баранкевіч Лілія Фаільеўна,* загадчык навукова-даследчага аддзела: тэл. (+375 17) 342 97 96; nio@bgam.by

*Аванесян Рузана Георгіеўна*, начальнік аддзела міжнародных сувязяў: тэл. (+375 17) 367 55 02; international@bgam.by

Па выніках канферэнцыі плануецца публікацыя навуковых артыкулаў. Яны прымаюцца па адрасе электроннай пошты nio@bgam.by да **22 студзеня 2027 года**.

Навуковы артыкул аб'ёмам 14000–25000 друкаваных знакаў павінен ўтрымліваць анатацыю на мове артыкула, рэзюмэ на англійскай мове, ключавыя словы. Тэкст артыкула афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, размешчанымі на сайце акадэміі (https://bgam.by/wp-content/uploads/2024/12/Trebovaniya-k-publikatsii-v-zhurnale-Vesti_bel.pdf). Да друку прымаюцца артыкулы, якія раней не публікаваліся. Аргкамітэт пакідае за сабой права адхіліць артыкулы, якія не адпавядаюць выкладзеным патрабаванням.

## ВАЖНЫЯ ДАТЫ

| | |
|---|---|
| **9 лістапада** | апошні дзень падачы заявак |
| **18 лістапада** | апошні дзень для прадастаўлення відэафайлаў выступленняў і тэкстаў стэндавых дакладаў |
| **24–27 лістапада** | правядзенне мерапрыемства |
| **22 студзеня 2027** | апошні дзень прыняцця навуковых артыкулаў для публікацыі (з прыкладаннем неабходных дакументаў у электронным фармаце) |

**Форма заяўкі на ўдзел у**
Міжнароднай навуковай канферэнцыі
**«Музычная адукацыя ў гістарычнай перспектыве: канстанты і метамарфозы»**
(запаўняецца без скарачэнняў і абрэвіятур)

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада, месца працы ці вучобы, вучоная ступень, вучонае званне дакладчыка | |
| Тэма даклада / паведамлення на круглым стале / прэзентацыі выдання, відэа-, аўдыяматэрыялаў | |
| Тэматыка даклада (у адпаведнасці з тэматыкай, пазначанай у інфармацыйным лісце) | |
| Форма ўдзелу:<br>- вочная<br>- завочная (відэазапіс даклада)<br>- завочная (стэндавы даклад) | |
| Анатацыя на мове даклада (да 150 слоў) | |
| Кантакты: нумар тэлефона, адрас электроннай пошты | |
| Для аспіранта (дактаранта) – звесткі пра навуковага кіраўніка (навуковага кансультанта): прозвішча, імя, імя па бацьку, месца працы, пасада, вучоная ступень, вучонае званне | |
| Дадатковыя звесткі (неабходныя тэхнічныя сродкі, іншае) | |
| *Для афармлення імяннога запрашэння (пры неабходнасці)* | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка арганізацыі, яго пасада, вучоная ступень, вучонае званне | |
| Паштовы адрас арганізацыі, тэл./факс, электронны адрас | |